***Вячаслаў Красулін***

# МУЗЫКА Ў РЫТУАЛЬНАЙ ПРАКТЫЦЫ ВАЛАЧОБНІКАЎ

Вялікдзень – веснавое свята ў гонар сонца, абуджэння прыроды і надыходу «вялікіх дзён» палявых работ. У дахрысціянскія часы на Беларусі на Вялікдзень адбываліся магічныя абрады з мэтай забеспячэння плоднасці жывёлы, урадлівасці зямлі, засцеражэння ад нягод. У першы велікодны вечар на Беларусі былі пашыраныя абыходы, падчас якіх дружыны валачобнікаў хадзілі па хатах і выконвалі валачобныя песні з зычаннем гаспадарам плёну на ніве, прыплоду ў статку, добрага здароўя, шчаслівай долі. Без асобы музыкі валачобны абрад не адбываўся. Вадзіць Стралу і Куст, пачынаць Зажынкі можна (а часам і трэба) было без музыкаў, валачаваць – не. У тэкстах валачобных песень можна прасачыць абавязковасць прысутнасці музыкі ў валачобным гурце.

Перакладчык Роберт Грэйвз лічыў, што ўсе сучасныя мастацкія жанры маюць светапоглядны і функцыянальны генезіс у неалітычных абрадах плоднасці і культу продкаў [3, с. 209], а танцоры, спевакі і музыкі – з’явіліся як падаўжальнікі традыцый іх служкаў. Постаць музыкі ў архаічнай традыцыйнай культуры надзелена шматлікімі магічнымі функцыямі. Ён не проста акампанаваў танцам і спевам, але і ствараў т.зв. «шумавую партытуру» свята – сігналізаваў: «Будзённасць скончылася, надышоў святочны час», – таму пачуўшы гукі колавай ліры, скрыпкі, дуды, беларусы прыпынялі справы па гаспадарцы і ішлі слухаць вандроўных музыкаў, якія неслі с сабою «выспы» святочнага часу, адвабленага ад прафаннага свету і даючага гармонію, спакой і задавальненне.

Адзін з першых сістэмных даследчыкаў традыцыйнай культуры беларусаў Павел Шэйн адзначаў, што музыка-скрыпак быў «абавязковым удзельнікам валачобнага абраду», і ў прыклад прыводзіў валачобны тэкст: «Нашы дары ни малыя, ні вялікія: / Пачынальнічку па палтыннічку, / Падхватнічкам па дзесяць яец, / Музычынку – чароўны злоты яму на боты, / Яшчэ к таму полсць саланіны, / Полсць саланіны – смычок падмазаць, / Штоб скрыпачка да йграла, / Штоб яна ні залегала» [7, с. 206]. Прааналізаваўшы выданні Шэйна, заснавалькік беларускай этнамузыкалогіі Інна Назіна прыйшла да высновы, што ў калядны і валачобны абрады «дуда і скрыпка … уключаюцца традыцыйна, ствараючы іх арганічную і неад’емную частку» [7, с. 206]. Вядома, што «уключэнне інструментальнай музыкі ў каляндарна-земляробчыя абрады адбылося ўжо на ранняй стадыі сацыяльнага развіцця чалавецтва, калі важным рэгулятарам функцыяніравання народнай творчасці была магія, *вера ў незвычайную сілу таго, што гаварылася, спявалася, і – трэба дадаць – і г р а л а с я* на музычным інсрументце» [1, с.20].

Сярод музычных інструментаў беларусаў, якія выкарыстоўвалі ў якасці магічных і гаспадарча-магічных сігнальных прыстасаванняў – перадусім называюць трубу, жалейку, рог, якімі найбольш актыўна карысталіся пастухі – адказныя за «жывёлаводчы» сектар традыцыйнай эканомікі. Літоўскія даследчыкі мясцовага валачобніцтва (lalauninkų) сцвярджаюць, што гукі дуды і ўдарных інструментаў у валачобным абрадзе павінны сімвалізаваць ляскание веснавой маланкі (гром Пяркунаса) – як знак веснавога абуджэння прыроды. Дарэчы, ёсць звесткі і выявы, дзе бачна, што рагаўні на літоўскіх дудах выраблялі з рагоў хатняй жывёлы. Міграцыя балтыйскіх плямёнаў на беларуска-літоўскія тэрыторыі эпохі металу звязана з культурай індаеўрапейскіх качавых народаў з жывёлаводствам як асноўным сродкам жыццезабеспячэння. Цікава, што ў культуры яшчэ аднаго народа, з Сярэднявечча пражываўшага на беларуска-літоўскія тэрыторыі і этнагенетычна маючага культурную спадчыну жывёлаводчых плямёнаў (але плямёнаў семіцкіх) – габрэяў – новы год пачынаўся з гуку трубы (выробленай з рогу барана), у якую ўрачыста трубілі ў культавым месцы – сінагоге. Там дарэчы, адбываліся не толькі чытанні сакральных тэкстаў і малітвы, але і спевы і нават харэаграфічныя дзеі, звязаныя з традыцыйнымі каляндарнымі святамі суполкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ




**Малюнак 1 – Нотны запіс беларускай вясельнай песні з дударскім акампанементам Г. Слаўчыка, зроблены пецярбуржцамі Яўгенам Гіпіўсам і Зінаідай Эвальд у 1930-я гг.**

Сярод музычных інструментаў беларусаў, якія выкарыстоўвалі ў якасці магічных і гаспадарча-магічных сігнальных прыстасаванняў – перадусім называюць трубу, жалейку, рог, якімі найбольш актыўна карысталіся пастухі – адказныя за «жывёлаводчы» сектар традыцыйнай эканомікі. Літоўскія даследчыкі мясцовага валачобніцтва (lalauninkų) сцвярджаюць, што гукі дуды і ўдарных інструментаў у валачобным абрадзе павінны сімвалізаваць лясканне веснавой маланкі (гром Пяркунаса) – як знак веснавога абуджэння прыроды. Дарэчы, ёсць звесткі і выявы, дзе бачна, што рагаўні на літоўскіх дудах выраблялі з рагоў хатняй жывёлы. Міграцыя балтыйскіх плямёнаў на беларуска-літоўскія тэрыторыі эпохі металу звязана з культурай індаеўрапейскіх качавых народаў з жывёлаводствам як асноўным сродкам жыццезабеспячэння. Цікава, што ў культуры яшчэ аднаго народа, з Сярэднявечча пражываўшага на беларуска-літоўскія тэрыторыі і этнагенетычна маючага культурную спадчыну жывёлаводчых плямёнаў (але плямёнаў семіцкіх) – габрэяў – новы год пачынаўся з гуку трубы (выраблена з рогу барана), у якую ўрачыста трубілі ў культавым месцы – сінагоге. Там дарэчы, адбываліся не толькі чытанні сакральных тэкстаў і малітвы, але і спевы і нават харэаграфічныя дзеі, звязаныя з традыцыйнымі каляндарнымі святамі суполкі.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ



**Малюнак 3 – Дудар Стахван Шахавец і паплечнікі, 1930-я гг.**



**Малюнак 4 – Дуда беларуска-літоўскага памежжа канца XIX ст. з фондаў Рускага этнаграфічнага музея Санкт-Пецярбурга**

Дуда і дудар неаднаразова ўзгаданы ў тэкстах валачобных песень: А нашаму дудару / Хоць кусок сала... / Хоць кусок сала – дуду падмазаць... / Штоб яна іграла, не залягала. [5, с. 147]. Шэраг акалічнасцей дазваляе сцвярджаць, што выкарыстанне дуды ў валачобнай партытуры знітавана з жывёлаводствам як тыпова мужчынскай справай, мужчынскімі суполкамі, у якія жанчыны не дапускаліся, з сістэмай каштоўнасцей закрытых суполак намадаў, што адсылае да індаеўрапейскіх культур. Сам тэмбр дуды з'яўляецца сцвярджэннем яе сігнальна-гукавой функцыі. Як вядома (па сцвярджэннях інфарматараў і выніках уласных практычных даследаванняў) хатнія жывёлы – пераважна гавяда – рэагуюць на тэмбр дуды ў абавязковым парадку, збіраюцца на яе гук. Гэта – сведчанне выкарыстання дуды ў гаспадарчай практыцы жывёлаводаў. Магічная функцыя на гукавыя прылады ўскладалася яшчэ з язычніцкіх часоў. Моцны гук, якім валодае дуда, і шум у народных уяўленнях – гэта сіла, якая абараняе чалавека і хатнюю жывёлу ад нячысцікаў. Паводле вераванняў беларусаў, дудар з'яўляўся сакральнай асобай, надзеленай звышнатуральнай сілай. У сувязі з гэтым прыгадаем занатоўку П.Шпілеўскага: «...на думку Беларусцаў, знахары-ваўкалакі – людзі не простыя, а як быццам складаюць асобую касту вышэйшых істот, якія маюць сувязь з нячыстымі духамі: у склад гэтай касты ўваходзяць дудары..., казачнікі накшталт баянаў, млынары... і пастухі» [8, с. 12]. Адсюль становіцца зразумелы сэнс наступных прымавак: «Сварыся з гаспадаром, толькі не бярыся з дударом»; «Як дудар сказаў, дык з людзей ваўкалакам стаў» [8, с. 150].

Абрадавыя найгрышы беларусаў на дудзе першым запісваў санкт-пецярбургскі этнограф Яўген Гіпіус [7, с. 39]. Апублікаваў ён толькі дударскі вясельны найгрыш, запісаны ад дудара Г.Слаўчыка (мал.1) [5, с. 252]. Пры аналізе найгрыша Слаўчыка і найгрышаў 1931 года дудара Стахвана Шахаўца (мал.3), знойдзеных даследчыкам Дзянісам Сухім, відавочна, што строй аўтэнтычных беларускіх дуд (мал. 4) (структурна, калі не браць да ўвагі відавочна ўводныя і дадатковыя другаступенныя ў танальным плане ноты) групуецца вакол пентахорда мінорнага нахілення «соль – до – ре – мі – фа», ці сэптахорда «соль – сі – до – ре – мі – фа – соль». У экспедыцыі ў Бешанковіцкім раёне ў 2011 годзе выпускным курсам спецыялізацыі «Этнафоназнаўства» быў запісаны інварыянт валачобнай песні «Слава таму, хто ў етым даму», якая вар'іруе вышэйузгаданы тэкст Шэйна і «ўкладаецца» ў ладавую структуру мінорнага нахілення, падобную на строй беларускай дуды (мал. 2) толькі тонам ніжэй. Па звестках этнафораў, песню яшчэ 25-30 год таму выконвалі пад скрыпку і бубен, зараз спяваюць пад гармонік.

Думаю, залішне моцна пераконваць, што мелодыка валачобных песень даволі часта дакладна паўтарае вышэйузгаданыя пентахордавыя і сэптахордавыя структуры: узнікае ўражанне, што мелодыі валачобнікаў не толькі «абапіраліся» на аўтэнтычную беларускую дуду, але і ўзніклі як вытворныя ад дударскіх найгрышаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Спіс літаратуры:**


1. Беларуская народная інструментальная музыка / фоназап., натацыя, рэд. і сістэм. найгрышаў, уступ. арт. і навук. камент. І.Д.Назінай. — Мн.: Навука і тэхніка, 1989. — 655 с.: нот. іл. — (Беларус. нар. творчасць / АН БССР. Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору).
2. Вялікдзень. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: http http://be-x-old.wikipedia.org/wiki/Вялікдзень. – Дата доступа : 10.04.2012.
3. Грейвс, Р. Белая Богиня : избр. главы / Р.Грейвс ; пер. с англ. И.Егорова. – СПб.: Амфора, 2000. – 382 с.
4. Музыкальные инструменты мира : энциклопедия. – Минск : ООО «Попурри», 2001. – 320 с.: ил.
5. Назіна, І.Д. Беларускія народныя музычныя інструменты / І.Д. Назіна. – Мн.: Беларусь, 1997. – 239 с.: іл.
6. Назіна, І.Дз. Дуда / І.Дз. Назіна // Беларускі фальклор: Энцыклапедыя : У 2 т. /Рэдкал. : Г.П.Пашкоў і інш. – Т. 1 : А капэлла – Куцця. – Мінск : БелЭн, 2005. – С. 445 – 446.
7. Назина, И.Д. Становление и развитие белорусского этноинструментоведения как специальной научной дисциплины / И.Д. Назина // Белорусская этномузыкология: Очерки истории (XIX – XX вв.) / З.Можейко, Т.Якименко, Т.Варфоломеева и др. ; под ред. З. Можейко. – Минск : Тэхналогія, 1997. – С. 199 – 232.
8. Шпилевский, П. Белорусские народные предания / П. Шпилевский // Журнал Министерства народного просвещеня. – 1846.
9. Шпилевский, П. Русский дневник / П. Шпилевский. – С-Пб, 1859. – № 101.
10. Шчадрына, Э. Да пытання музычна-інструметальнага суправаджэння велікодных святкаванняў / Э. Шчадрына // Аўтэнтычны фальклор: праблемы бытавання, вывучэння, перайманння: зборнік навуковых прац удзельнікаў II Рэспубліканскай навукова-метадычнай канферэнцыі (Мінск, 27–28 сакавіка 2008 г.) / БДУКМ ; рэдкал.: Мажэйка М.А. (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БДУКМ, 2009. – с. 25 – 29.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ